Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ДА ПРАЦЫ

...ва разы у тыдзень.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 2 Вільня, Панядзелак 3-га сьнежня 1928 г. Год 1

Адзінкі і масы.

У навуцы аб грамадзянстве доўгі час цягнулася спрэчка аб тым, хто зьяўляецца галоўным чыньнікам поступу, ці то краўнікам жыцьця — адзінкі, г. зв. павадыры, ці самыя масы. Буржуазная навука больш схіляецца да першае думкі, да думкі, што гэтай пружынай зьяўляюцца паасобныя прадстаўнікі грамадзянства — г. зв. павадыры і ўся гісторыя ў школах выкладаецца, як гісторыя каралеў і выбітных адзінак... На гэтым-жа пункце становіча стаіць гэтак званая ідэалістычная школа.

Аднак, жыцьцё нішчыць зусім гэтую думку—і вельмі часта тыя адзінкі, якія праняліся думкай, што яны зьяўляюцца павадырамі, нейкімі бязгрэшнымі кумірамі, якім можна вясьці масы, куды толькі яны (павадыры) пажадаюць—гэтыя адзінкі дорага плацяць за сваё асьляпленьне. З часам, калі яны думаюць у сваім асьляпленьні пакіраваць жыцьцё ў бок, які непажаданы масам — гэтыя апошнія кідаюць сваіх даўнейшых павадыроў і высоўваюць для барацьбы за свае інтарэсы новых прадстаўнікоў. А г. зв. павадыр бяз масаў — жывы нябошчык, якому астаецца толькі горка плакаць, што „яго масы не разумеюць“.

Бо запраўды ў грамадзкім жыцьці, об'ектыўна кажучы, кіруюць г. зв. матар'яльныя абставіны, тыя ўмовы, у якіх прыходзіцца жыць данаму грамадзянству.

Як кажуць папулярна — *цар-голад кіруе жыцьцём*, цар-голад стварае пэўны настрой у шырэйшых колах грамадзянства, г. зв. псыхолёгію, якая паступова перарабляецца ў ідэалёгію, у цэлы збор праводных думак, якія і надаюць самому жыцьцю пэўны тэмп. Масы жывуць гэтымі настроямі і высоўваюць час ад часу паасобныя адзінкі, каб прадстаўляць гэтыя думкі, бараніць іх. У такім выпадку адзінкі датуль зьяўляюцца нібы павадырамі масаў, пакуль разумеюць думкі масаў, змагаюцца за іх, праводзяць іх у жыцьцё. Павадыр—гэта прадстаўнік масаў, высунуты імі на чало для барацьбы за свае правы і інтарэсы. Ен прызнаецца павадыром датуль, пакуль прадстаўляе і бароніць думкі і настроі масаў; паскольқі-ж ён збочыў з гэтага шляху — паступова адпадае і зусім адыходзіць ад жыцьця, ці, як кажуць — ідзе ў каносу, нябыцьцё.

Гэта зразумела матэрыялістычная школа, якая пераважна сталася пралетарскай школай навукі аб грамадзянстве. Гэтая школа з бегам часу набывае ўсё больш і больш прызнаньня ў сьвеце і становіцца ўрэшце школай, якая адзіна правільна ацэньвае ўсе зьявішчы грамадзкага жыцьця. Можна сказаць, што цяпер толькі гэтая школа пануе ў грамадзкай навуцы, нішчучы паступова, як „народалюбівых“ ідэалістаў, гэтак змушаючы і буржуазію прызнаць голую праўду.

Ня гледзячы, аднак, на агульнае прызнаньне матэрыялістычна-пралетарская школа аб грамадзянстве не набыла столькі павагі, каб ўжо цяпер пры дапамозе яе тлумачыць усе зьявішчы жыцьця. Яшчэ і цяпер мы стала чуем байкі аб Напалеонах, розных каралёх, выдатных асабістасьцях цяперашняга часу.

Чым гэта тлумачыць? А вельмі проста. Буржуазіі нявыгадна матэрыялістычны пагляд на рэчы, ён нішчыць самае яе існаваньне, якое абапёрта ўласьне на ролі адзінак (багатых) і падпарадкаваньні сабе масаў. Буржуазія, разумеючы праўду матэрыялістычнага сьветапагляду, сьвядома робіць іншае, талкуючы масам аб іншым. Цяпер думка аб надзвычайнай ролі адзінак надзвычайна папулярная сярод буржуазіі і праводзіцца ўсім прэсам дзяржаўна-грамадзкага апарату. Мы ня хочам гэтым зразумелым для ўсіх думкам надаваць канкрэтную форму — даволі пачытаць хоць-бы „Słowo“ і „Kurjer“, каб пераканацца ў падобным. Каротка — цяперашняя г. зв. санацыя асноўвае сваю ідэалёгію на ролі адзінак. Але для беларускіх працоўных масаў ёсьць больш насьпеўшыя справы дня, больш актуальныя для іх саміх, што і выклікала вышэйшыя развaжаньні.

Як ведама, у нас ёсьць свая, беларуская санацыя, якая якраз будавала і будуе свае думкі на „бліску сваіх імяньняў“. Яна раскошна разумее ўсю праўду вышэйпрыведзеных словаў, але, спалягаючыся на нядаўнюю сваю папулярнасьць сярод масаў, ня гледзячы на поўную кампрамітацыю цяпер — яшчэ далёка ня губляе думкі абдураньня масаў выстаўленьнем перад імі такіх імяньняў, якія з розных прычынаў яшчэ ня выяўлены. Людзі хворага гонару, мнячыя сябе нейкімі багатырамі — асілкамі, яны, бязумоўна прадаўшыся ворагам працоўных, робяць усё магчымае, каб скампраметаваць у масах новых прадстаўнікоў і абаронцаў сялянска-работніцкае справы, з аднаго боку, дзяржучыся за полы купіўшых іх паноў, а з другога — высьвятляючы сябе нявіннымі ягняткамі—мучаньнікамі і нібы за справу тых-жа беларускіх працоўных масаў, мучаньнікамі, якіх цяперашнія „Інтэрнацыянальныя жулікі“ аблепліваюць гразьзю. Зьезд Т-ва Бел. Школы, які ўжо, як ведама, вызначаны на 9—10 сьнежня — яны якраз і думаюць выкарыстаць, каб усімі спосабамі і ашукаць масы і панізіць ненавісных „інтэрнацыянальных жулікаў“.

Мы не баімся гэтага. Справа беларускіх працоўных гушчаў у канчальным падрахунку ня вельмі будзе пакутаваць. Але ўсё-ж ёсьць вялікая небясьпека для масаў адцягнуць на час барацьбу, быць зацемненымі рознымі „высокімі“ словамі і „бліскучымі“ імяньнямі, небясьпека можа адыходу на некаторы час часткі працоўных сілаў ад агульнага, адзінага фронту сялянска-работніцкай барацьбы. Мы мусім прыпомніць беларускім сялянам і работнікам часы рэвалюцыі 1905 году, калі царскія ахраньнікі (дэфэнзыўшчыкі) з Зубатовым на чале, карыстаючыся дэмагогічнымі фразамі і вытвараную праз гэта папулярнасьцю іх імяньняў—у аканчальным падрахунку справакавалі справу працоўных. Тое самае хочуць зрабіць і нашыя Зубатовы.

Мы, аднак, спадзяёмся, што здаровы інстынкт масаў, высокая грамадзкая сьпеласьць дэлегатаў масаў на Зьезьдзе не дазволіць сябе справакаваць рознымі „бліскучымі імяньнямі“, а найдуць магчымасьць зразумець усю сутнасьць беларускай зубатаўшчыны і адкінуць іх, як непатрэбнае лахманьнё.

Абвестка.

Гэтым даводзіцца да ведама Акружных Управаў і Гурткоў Т-ва Бел. Школы, што 9 і 10 сьнежня 1928 г. у Вільні ў памяшчэньні пры вул. Сьвятой Ганны № 2, адбудзецца **Агульны Сход** Т-ва Бел. Школы з наступным парадкам дня:

1. Выбары Прэзыдыуму Сходу,
2. Выбары Мандатнае Камісіі,
3. Выбары ганаровых сяброў,
4. Даклад аб дзейнасьці Таварыства,
5. Даклад з месц,
6. Рэфэрат „Праграмы Працы Т-ва“,
7. Рэфэрат „Пазашкольная Асьвета“,
8. Рэф. „Белар. Асьвета й Самаўрады“,
9. Рэф. „Значэньне Т-ва Бел. Школы для Беларускага Народу“,
10. Выбары Галоўнае Управы,
11. Выбары Наглядчае Рады,
12. Рэф. „Беларуск. мова й літэратура“,
13. Рэф. „Праца жанчыны ў Т. Б. Ш.“,
14. Рэф. „Каапэрацыя ў вёсцы“,
15. Рэф. „Аб Радыё“,
16. Экскурсія ў Музэй ім. Ів. Луцкевіча.

Згодна з артыкулам VII Статуту і інструкцыяй, выданай Дачаснай Паўнамоцнай Камісіяй, якая, (інструкцыя), разаслана у свой час Акружным Управам і апублікавана ў прэсе, за правамоцных дэлегатаў на Агульны Сход Таварыства ўважаюцца тыя дэлегаты, якія выбраны па 2-х ад Акружных Управаў і ад Вокругаў па 2-х, выбіраных на Агульным Сходзе дэлегатаў ад Гурткоў Вокругаў і прадставяць пратаколы Сходаў аб адбытым выбары.

Калі-б Агульны Сход Таварыства дзеля якіх колечы прычын не адбыўся 9—10 сьнежня, то, згодна з § 33 Статуту, адбудзецца паўторны Сход праз 2 тыдні, і пастановы яго будуць лічыцца правамоцнымі, незалежна ад ліку сабраўшыхся дэлегатаў.

Дачасная Паўнамоцная Камісія пацьвярджае, што выдаткі на падарожу дэлегатаў пакрываюць Акружныя Управы і Вокругі. Акром таго, дэлегаты павінны запасьціся ежаю на 2 дні. Галоўная Управа забясьпечвае дэлегатам памешканьне для начлегу і кіпяток на гарбату.

Сход пачнецца ў 9 газін раніцы ў нядзелю 9 сьнежня.

Вільня 23.XI 1928 г. — **Дачасная Паўнамоцная Камісія.**

Падзеньне „лібэральнага“ габінэту у Румыніі і—новы „сялянскі“ урад.

Вестка аб адстаўцы ненавіснага для вялізарнай большасьці насяленьня ўраду Братыяну выклікала вялікую радасьць у краі, асабліва сярод краёвага сялянства, якое, на чале з сваімі павадырамі — даўно дамагалася гэтай адстаўкі, каб узяць урад амаль не цалком у свае рукі. Як ведама, румынскае сялянства, дабрабыт якога значна падняты быў у свой час зрэалізаванай шырокай зямельнай рэформай, прадстаўляе цяпер сілу, з якой вельмі паважна змушаны лічыцца ўсялякія „палітычныя чыньнікі“ ў краі. Адстаўка „лібэральнага ўраду“ якраз і адчыніла ўрэшце шлях для румынскага сялянства да ўлады. Па ўсяму краю пачалі адбывацца мітынгі і зьезды сялян, якія ўсе ў адзін голас пастанаўлялі, каб павадыры „нацыянальна-сялянскай партыі“ з п. Маніў на чале ўзялі цалком у свае рукі тварэньне ўраду. З другога боку, павадыры іншых партыяў, побач з праваліўшыміся ўрэшце „лібэраламі“ — пачалі націскаць на „Рэгенцыйную Раду“ (заступаючую 7-летняга „караля“), каб канешне настаяла на стварэньні „коаліцыйнага“ ўраду, (гэта значыць — складзенага з чым большага ліку партыяў). Усе гэтыя проці-сялянскія групы з павадырамі — Братыяну, Авэрэску, Іорга і Лупу на чале — націскаюць, каб прышлы ўрад канешне не рабіў новых выбараў. Зразумела чаму: гэты парлямант „зроблены“ ўрадам Брытаяну, — на выбарах, якія завуцца „балканскімі“ дый якія ў Румыніі даюць заўсёды... ня менш, як 70 працэнтавую большасьць „ўрадавай партыі“!... Але павадыр румынскага сялянства рашуча адмовіўся — пад магутным націскам з мейсцаў — ад учасьця ў коаліцыі на такіх варунках, заявіўшы, што першы пункт яго праграмы і тактыкі, гэта — безадкладныя новыя выбары, каб зьліквідаваць той сойм, які створаны машэнствамі і гвалтамі папярэдняга ўраду... дый зусім не адказвае запраўдным настроям і волі вялізарнай большасьці ў краі — сялянства.

Можна зразумець, чым пагражалі-б усім гэтым групам, наагул фэадальна-буржуазнай пірамідзе румынскага грамадзянства такія вольныя выбары ў краі, праведзеныя ўдадатак яшчэ сялянскім урадам Маніў... Дык дзіва, што ўсе іншыя партыі Румыніі, побач з Рэгенцыйнай Радай, — прабуюць усялякіх спосабаў і шляхоў, каб неяк выйсьці з урадавага крызісу — бяз новых выбараў.

Таму — пасьля сьцягу няўдалых кандыдатураў быў высунуты Радай на прэм'ера новага ўраду былы мін. загран. спраў ураду Братыяну, румынскі пасол у Англіі — Тытулеску, які і быў зараз-жа выкліканы Радай з Лёндану.

Пакуль чакалі прыезду Тытулеску з Лёндану, каралеўскія колы рабілі ўсьцяж націск на сялянскага павадыра Маніў, каб той прыступіў да коаліцыі.

Але і сам Маніў і прэса яго партыі ясна высьвятляе ўсю недарэчнасьць і нерэальнасьць гэтай коаліцыі, спробы якой ужо рабіліся неаднойчы Братыяну — з аднолькавым непасьпехам: ніякая коаліцыя ня здольная будзе працаваць разам з Соймам, які мае большасьць адной „лібэральнай“ партыі, дый яшчэ „зробленую“ шляхам страшэнных выбарных гвалтаў над тымі партыямі, якія цяпер запрашаюцца да коаліцыі!...

„Рэгенцыйная Рада“ павінна пашукаць іншых шляхоў для выхаду з сітуацыі, створанай „лібэраламі“—з яе „благаслаўленьня“, забіўча іранізуе прэса Маніў.

І запраўдную паніку сярод урадавых колаў выклікала вестка, быццам Тытулеску тэлеграфаваў з Лёндану, што згаджаецца быць... міністрам заграпічных спраў у габінэце Маніў!... Але—„на шчасьце“ — вестка здаецца аказалася „ня зусім праўдзівай“. Тытулеску прыехаў, і ўсьцяж канфэруе з павадырамі партыяў, але — без усялякага пасьпеху. На коаліцыю — з новымі выбарамі — не згаджаецца Братыяну з сваімі „лібэраламі, якія добра ведаюць, што новыя выбары будуць няўхільным канцом коаліцыі, даўшы бясспрэчную перамогу сялянскім мандатам; на коаліцыю — бяз новых выбараў — не згаджаецца, ня гледзячы на ўсе націскі з боку Рады і каралеўскага двара і „суседніх партыяў“ — павадыр сялянства Маніў.

Такім чынам акцыя п. Тытулеску аказваецца, як і можна было згары спадзявацца, яўна безнадзейнай і ўсё больш высоўваецца, як адзіная рэальная, але потым ня менш „небясьпечная“ для ўсяго традыцыйнага ладу ў Румыніі, — урадавая камбінацыя з Маніў, як прэм'ерам, і сялянскай партыяй у цэнтры... Ці пойдзе на гэту „рызыку“ ўся „піраміда“ вышэйшага румынскага грамадзянства, яшчэ дагэтуль ня высьветлілася. Апошнія весткі кажуць аб спробах з праф. Іоргі, як прэм'ерам. (Партыя Іоргі, здаецца, нешта падобнае да нашай „эндэцыі“, але — значна слабейшая).

Але аб тым, што сялянскі ўрад мае ўжо вялікія шансы перамагчы ўсе спрацівы і зрэалізавацца, відаць з тэй асьцярожнай падрыхтоўкі згары міжнароднай апініі, якую пачала рабіць румынская дыплёматыя заграніцай. А імянна, — у органе румынскага мін. заграцічных справаў, выдаваным у французкай мове („Незалежная Румынія“), чарговая перадавіца заяўляе, што — „як-бы ня быў разьвязаны сучасны ўрадавы крызіс у Румыніі, яе заграцічная палітыка ў кожным разе астанецца нязьменнай“... „Вернасьць Румыніі Малай Антаньце“, і асабліва — адносна Югаславіі, саюз з якой забясьпечвае Румыніі яе заходнія і паўдзённыя граніцы, на якія ўсьцяж заяўляюць прэтэнзіі яе суседзі з гэтых бакоў, — „застанецца заўсёды непахільнай“... „Таксама брацкі саюз з Польшчай, які ахоўвае (?) Румынію ад усялякіх неспадзяванак з боку Радавай Расеі, дзе ў апошні час рыхтуюцца вялікія пераваротьі (?), як ведае кожны, — таксама моцны ў Букарэшце, як і ў Варшаве“... Таксама і адносна ўсіх іншых дзяржаваў „асноўныя лініі румынскай палітыкі застануцца тыя-ж надалей“... Ясна, што трэба цяпер румынскаму ўраду самому супакойваць сваіх прыяцеляў і саюзьнікаў ад тых самых страхаў, якімі іх усьцяж страшыў сам урад Братыяну, даводзячы ўсьцяж, што „сялянскі рух у Румыніі—чыста бальшавіцкі“, — што „павадыры нацыянальна-сялянскай партыі ня толькі зносяцца з Масквой, але і атрымліваюць грошы на барацьбу з „лібэраламі“ — ад III Інтэрнацыяналу“!... Трэба супакойваць — таму, што яўна на чаргу дня стала няўхільнасьць стварэньня сялянскага ўраду ў каралеўска-баярскай Румыніі...

Ці запраўды ўрад у Румыніі награжае такімі ўжо глыбокімі „устрасеньнямі" ў краі?.. Хіба-ж, што не! На тое гэта партыя — „нацыянальна-сялянская", нешта ў родзе нашых „пястоўцаў", ці мо — правых „вызваленцаў" (таксама і завуцца кавет „цараністы"). Але, што бясспрэчна, так гэта тое, што — непадзельнае панаваньне ў краі, як дагэтуль, баярскай—буйна ўласьніцкай сапалкі — пад назовам „лібэралаў" скончылася, і — трэба думаць — назаўсёды.

Новы румынскі ўрад пас. Маніў.

10.XI сябры новага габінэту пас. Маніў злажылі прысягу. На чале ўраду, як прэм'ер, стаіць павадыр „нацыянальна-сялянскай партыі" пасол Маніў. Мін. унутран. спраў — Вайда, загр. праф. Міровэску (як цьвердзяць — толькі часова: пасьля выбараў мае кіраўніцтва ўзяць у свае рукі Тытулеску, які аб'явіў ужо гэта Маніў) і т. д. У склад ўраду ўваходзяць 7 міністраў з 16 — прадстаўнікі Сяміградзьдзя, як і сам прэм Маніў, рэшта — з тэрыторыі даваеннай Румыніі (Сяміградзьдзе вялізарны край, далучаны да Румыніі ў выніку міру — коштам даваеннай Вэнгрыі; край, які, пазбаўлены цалком былых вэнгерскіх валадароў—абшарнікаў, аказаўся цалком у руках атрымаўшага зямлю апошніх — сялянства).

Крыху аб нашых падатках.

Каждаму больш-менш сьвядомаму нашаму чытачу хіба ведама, што для жыцьця кожнай дзяржаве патрэбны засобы яе ўтрыманьня—грошы. Ведама так жа і тое, што грошы дзяржава (дзярж. улада) на сваё ўтрыманьне ня робіць сама, а бярэ іх ў форме розных падаткаў ад усяго жыхарства дзяржавы, пераважна ад працоўных.

Але не заўсёды ў дзяржаве хапае сваіх грошай на абслужваньне яе патрэбаў—тады яна мусіць пазычаць грошы ў суседзяў, ці кажучы сучаснай мовай — даставаць заграпічныя пазычкі.

Што тычыцца ў гэтых адносінах Польшчы, дык Польшча ад дня свайго паўстаньня стала карыстацца заграпічнымі пазычкамі. Галоўнымі турботамі каждага яе ўраду зьяўлялася раздабыцьцё заграпічнага граша, бо ж край ня можа сам пакрыць калясальныя расходы на ўтрыманьне дзяржаўнага (бюракратычнага) апарату і войска. Каб хоць трохі падперці ці залатаць свой бюджэт, польская ўлада заўсёды зьвярталася па пазычкі.

Але трэба ведаць, што пазычкі не заўсёды даюцца, хоць заграпічныя капіталісты і любяць польскую буржуазію. Гэта тлумачыцца тым, што за 10 гадоў існаваньня Польшчы заграпічныя капіталісты страцілі дужа даверыя да Польшчы, галоўнае з 2-х прычынаў: гаспадарчай і палітычнай. Гаспадарчая прычына крыецца ў тым, што польская буржуазія ня ўмее гаспадарыць, напр. сталы гандлёвы дэфіцыт, дайшоўшы ў гэтым годзе ўжо да вялізарнай сумы 900 мільёнаў злотых.

Палітычная прычына недаверыя заграпічнага капіталу да Польшчы крыецца ў адносінах улады да нац. меншасьцяў і Сойму.

Аднак, і з такой бядой пазычаны грош яшчэ далёка ад праўдзівага ратунку, бо ён высока апрацэнтоўваецца і цягне за сабою „пэўныя" забавязаньні, тым цяжэйшыя для пазычаючага, чым больш яны яму патрэбны, чым горшае яго становішча: чым больш падае яго валюта. Спыніўшы паданьне, „устабілізаваўшы" сваю валюту (што пры няўмелай гаспадарцы вельмі трудна, напр. злоты па курсу даляра быў „устабілізаваны" 5,18 зл. за даляр, а цяпер той-жа даляр каштуе 8,88; 8,90 зл.) і каб яе ўдзяржаць на гэтай роўні, урад прыступае да падаткавай шрубы і шрубуе ею няміласэрна, абы толькі здабыць як найбольш грошай.

Дзеля гэтага то ў Польшчы падаткі і знаходзяцца проста ў хаотычным становішчы. Да гэтага часу яшчэ няма сталых падаткаў: касаваліся адны, уводзіліся другія, усё йшло ў залежнасьці ад большага ці меншага дэфіцыту. Але ўсе гэтыя прытарнаваньні да дэфіцыту, ніяк не маглі забясьпечыць бюджэтнае раўнавагі, і дэфіцыт, як быў, так і ёсьць. Для пакрыцьця яго заўсёды трэба было шукаць чагось новага.

Гэтага „новага шукалі ўсе папярэднія ўрады, шукае яго і цяперашні „санацыйны" ўрад. Так, 6 г. лістапада паданы ў Сойм аж 4 урадовыя законапраекты падаткаў. Праект сталага маёнткавага падатку, аб павялічэньні грунтовага і ад памешканьняў і праект зьмяншэньня прамысловага падатку ад абаротаў.

Згодна з новым маёнткавым праектам, усе маёнткі (гаспадаркі) вартасьці ад 10 да 15 тысяч злотых будуць плаціць у год па 4 злоты ад тысячы. Маёнткі большай вартасьці будуць плаціць па 5 зл. ад тысячы.

Для сялянства гэта вялікая несправядлівасьць.

Пры цяперашніх цэнах на зямлю, якая сярэдня цэніцца ад 1 да 2 з паловай тысяч злотых за дзесяціну (цяпер урадава ўведзены гэктар—крыху менш за дзес.), маёнткавы падатак будуць плаціць і сялянскія гаспадаркі ад 4—6 гэктараў (дзесяцін). Значыць, такая сялянская гаспадарка, якая ледва пракормлівае сям'ю пры цяжкай працы ўсей сям'і, будзе ў год плаціць 40—60 злотых. А вялізарныя панскія маёнткі, што даюць пану дзесяткі і сотні тысячаў чыстага даходу будуць плаціць толькі 5 злотых ад кожнае тысячы вартасьці маёнтку!

Кожная сялянская сям'я сама працуе і заўсёды дакладае да такой гаспадаркі ўвесь свой пабочны заработак, а законапраект хоча што-год браць ад беднага сялянства паважную суму і перакінуць яе на ўтрыманьне дзяржаўнага апарату, што, па нашай думцы, павінна быць наадварот: падаткі мусяць быць у кожнай дзяржаве, але мусяць быць пасільнымі (як гэта робіцца ў дзяржаве, дзе ўладу маюць працоўныя масы), іх мае плаціць той, хто мае. Цяперашні-ж праект зусім ня лічыцца з гэтай падставай. Ен ня ўводзіць поступу (надвышкі), што большая ўласнасьць мусіць плаціць большыя падаткі, а дробныя, бедныя гаспадаркі, звольнены ад іх.

Трэба яшчэ адзначыць, што з днём увходу ў жыцьцё сталага маёнткавага падатку, тымчасовы траціць сілу. А тымчасовага паны яшчэ не заплацілі больш 500 мільёнаў злотых, якія ім даруюцца. І гэта тым часам, калі за якую залатоўку „нядоімкі" беднага селяніна, сэквэстраваўся яго „маёнтак" (жабрачы...).

Другі праект—грунтовы — мае на мэце павялічыць на 100 проц. (у 2 разы!) грунтовы падатак.

Разам з павялічэньнем грунтовага, павялічваюцца і камунальныя (самаўрадавыя) падаткі. Праект пазваляе пабіраць на ўтрыманьне самаўрадаў 150 проц. грунтовага падатку. Разумеецца, што соймікі ад свайго не адмовяцца. Словам, гэтыя два падаткі вельмі добры новагодні гасьцінец для сялянства.

Трэці праект, гэта праект павялічэньня падатку ад гарадзкіх памешканьняў. Ен зьяўляецца нічым іншым, як заменаю ўпаўшага ў Сойме ўрадавага праекту аб ападаткаваньні дзяржаўным падаткам сялянскіх забудаваньняў. Але, як кіем, дык палкаю. Заплаціць яго не сялянская, а гарадзкая беднота, работнікі-лёкатары. Тут, як і там, ня робіцца вынятку—і бедната ападаткоўваецца аднолькава з багачамі (ад памешканьня).

Чацьверты праект прадбачыць зьменшаньне аж напалову прамысловага падатку ад абароту, які да гэтага часу плацілі большыя капіталісты і прамыслоўцы. Калі гэты праект Сойм прыме, (а прыйме, бо большасьць яго буржуазная), дык вышэйшая кляса (вызыску) дастане паважныя прывілеі перад працоўнымі гушчамі Польшчы.

Гэтыя 4 праекты і зьяўляюцца „новымі" сродкамі ратаваньня бюджэтнае раўнавагі, ці, як сказаў мін. скарбу Чэховіч, маюць „нармаваць" падаткі. Але на чыю карысьць йдзе гэтае нармаваньне, ня трэба казаць, бо гэта найвыразьней гавораць самі праекты.

З Сойму.

На соймавым паседжаньні 23 лістапада разгледжана толькі дзьве справы: справу — прызнаньня правоў уласнасьці былых арандатараў на абшарах усходніх ваяводзтваў і справу чатырох урадавых праектаў—аб зьмене падаткаў.

Першая справа, паводле рэфэрату, аснована на тым, што ў часе расейскай улады ня ўсім наляком можна было мець зямлю на свае імя ў цяперашніх усходніх ваяводзтвах і яны яе мусілі арэндаваць. Цяпер-жа хочуць скасаваць гэтую арэнду і прызнаць арэндаваную зямлю на ўласнасьць арэндатараў.

Натуральна, што да самога ўрадавага праекту „новэлізацыі" рознымі партыямі было дана дужа направак. На гэтыя „чужыя" папраўкі прэм'ер Бартэль адказаў, што дзеля таго, што неўрадавых направак вельмі шмат і пры тым яны ня скаардынаваны, а справа вельмі пільная, дык ён падае цэлы рад сваіх (урадавых) направак, з якіх адна выключае прызнаньне права на ўласнасьць арэнды „не паляком"—гэта значыць: беларусам, украінцам і г. д. Зразумела, што такая „дэмакратычная" (і „панадклясавая") папраўка ўраду выклікала ў Сойме цэлую буру пратэстаў нацыян. меншасьцяў, аднагалосна выказаўшыся проці папраўкі.

Цікава, што проці папраўкі быў мін. зямельных рэформаў Станевіч.

У даволі цікавым становішчы апынуўся і клюб ББ, за якім з сваіх міністраў галасаваць, ці мо' зусім не галасаваць, каб значыцца нікога не ўгнявіць. І вось, пасьля некалькі-гадзіннага думаньня „Бэ-Бэ" пастанавіла не галасаваць і ў часе галасаваньня ўсе вышлі з салі. Дзякуючы гэтаму, урадовая папраўка адпала.

З урадовых падаткавых праектаў мусім адзначыць праект аб павялічэньні грунтовых падаткаў і праект зьмяншэньня падатку ад прамысловага абароту. Сама рэч ужо паказвае, што гэтыя праекты цяжка адазвуцца на абяднеўшым сялянстве і, разумеецца, што сялянскія прадстаўнікі — перадусім нацыянальныя меншасьці — выказаліся проці іх, аднак, большасьць была за ўрадам і праект прыняты.

У часе галасаваньня агульную ўвагу зьвярнула на сябе тое, што ППС, зьвязаўшаяся нядаўна з Вызваленьнем і Str. Chł. у адну „апазыцыйную групу дзеля абароны дэмакратыі" — галасавала проці сваіх „апазыцыйных" саюзьнікаў (Вызвал. і „Str. Chł.") за ўрадам, а „саюзьнікі" („Вызвал. і „Stron. Chłop.") проці ўраду і ППС.

Вось, дык добры пачатак супольнай абароны працоўных сацыял-эраднікамі — пачай быць ня можа!..

27/XI на паседжаньні бюджэтнай камісіі вялася далейшая дыскусія над бюджэтам мін. унутраных спраў.

Прамовы апазіцыі былі скіраваны, галоўным чынам, проці прызнаньня міністру сакрэтнага фонду (сумы) ў бюджэце і проці асобы самаго мін. Складкоўскага, якому адмаўлялася у даверры, пры чым адзначалася, што паліцыя (Gazeta Warszawska № 253) ужываецца часта для агранічэньня грамадзкіх правоў, асабліва ў адносінах вольнасьці сабраньняў.

Пад час прамовы пасла Цэлевіча (украінец), які востра крытыкаваў урад за яго палітыку ўціску нацыянальных меншасьцяў, паўстала вострая абмена славамі паміж пасламі Хруцкім (украін. пас. клюб) і Палякевічам (ББ).

За тое, што п. Хруцкі сказаў п. Палякевічу: „пан думае, як жандарм!" той апошні пад час перарыву на карыдоры ўдарыў два разы Хруцкага па твары, справа перадана ў Маршалкоўскі суд.

Як відаць, зьдзічэньне пана Палякевіча „бэбэхаўца", дайшло да: „шчыра дзякую".

Пасьля палудня ізноў сабралася бюджэтная камісія, каб выслухаць прамову п. мін. Складкоўскага перад галасаваньнем камісіі над бюджэтам мін. унутр. спраў.

У сваей прамове п. Мін. зазначыў, што стан „bezpieczeństwa" папраўіўся, заўважаецца пэўнае аслабленьне камуністычнай арганізацыі, за тое узрастае небясьпека проці дзяржаўнай працы сярод нацыянальных меншасьцяў, асабліва ўкраінцаў.

У канцы сваей прамовы п. Мін. заявіў, што, дзеля таго, што яму былі скрэсьлены Соймам дыспазыцыйныя сумы (сэкрэтны фонд) на 1928 — 1929 бюджэтны год, але ён не схацеў паддацца ў адстаўку, — дзеля таго, Рада Міністраў ухваліла яму неабходныя крэдыты.

Гэткая міністэрская заява зрабіла вялікае ўражаньне ў пасольскіх кругах.

Справаздачу аб далейшым працягу Соймавых працаў з прычыны канфіскатаў адкладаем да наступнага нумару.

Залажэньне спажывецкага каапэратыву на вёсцы.

На вёсцы часта сяляне, маючы замер залажыць Спажывецкі Каапэратыў, ня могуць пачаць працу. Іх прыпыняе нейкая няпэўнасьць у сабе і няцьвёрдасьць знаньня спосабу і парадку выкананьня вымаганых уставамі фармальнасьцяў. Вось з гэтых прычынаў у шмат мясцох справа арганізацыі Каапэратыву адцягваецца. Папулярную брашуру М. Манцэвіча „Як залажыць Спажывецкі Каапэратыў" ужо можна спаткаць ува ўсіх куточках нашае Бацькаўшчыны і ў гэтай брашуры ёсьць усё, што трэба выканаць пры залажэньні Каапэратыва. Аднак-жа, паўтараю, нейкая няпэўнасьць затрымлівае справу. Вось дзеля гэтага я і падаю ў відзе прыкладу спосаб выкананьня фармальнасьцяў, зьвязаных з арганізацыяй Спажывецкага Каапэратыву на нашых вёсках. Бадзёра і адважна бярэцеся за справу, з пэўнасьцяй і глыбокім пераконаньнем вядзеце яе і вынік заўсёды будзе найлепшы.

Прыклад.

Група сялян вёскі Пярэччы, Галынскае гміны, Віленскага павету мае замер у сваёй вёсцы залажыць Спажывецкі Каапэратыў. Дзеля гэтага адзін з іх, Міхась Лебяда, піша да Старосты просьбу аб дазвол на скліканьне Арганізацыйнага Сходу.

Do Pana Starosty na powiat Wileński.

Lebiedy Michała, zamieszkałego we wsi Piereczy, gm. Hołyńskiej, pow. Wileńskiego

PODANIE.

Mam zaszczyt uprzejmię prosić Pana Starostę o zezwolenie na zwołanie Zgromadzenia organizacyjnego we wsi Piereczy, gminy, Hołyńskiej w domie № 45 Jana Borody na dzień 20 listopada 1928 r. na godzinę 12, celem założenia Spółdzielni Spożywców w tej że wsi z następującym porządkiem obrad: 1) Zagajenie i wybory przewodniczącego, assesorów i sekretarza Zgromadzenia, 2) Pogadanka: „Cel i zadania Spółdzielni Spożywców", 3) Omówienie zasad Statutu Spółdzielni, 4) Rozdanie deklaracyj członkowskich i podpisanie ich przez obecnych, 5) Przyjęcie i podpisanie statutu, 6) Wybory Rady Nadzorczej, 7) Oznaczenie najwyższej sumy zabowiązań Spółdzielni, 8) Wolne wnioski.

Pogadankę o celach i zadaniach Spółdzielni Spożywców wygłosi p. Drozd Aleksy, mieszkaniec wsi Kozły, gminy Hołyńskiej.

Ja niżejpodpisany Lebieda Michał jstem organizatorem Spółdzielni oraz poniosę wszelką odpowiedzialność za mające się odbyć Zgromadzenie.

Dnia 5 listopada 1928 r. wieś Piereczy. Michał Lebieda.

Просьба гэта была падана за 15 дзён да таго дня, калі меўся быць Арганізацыйны сход. За гэты час да дня 20-га лістапада 1928 г. сяляне, якія зацікаўлены арганізацыяй, стараюцца зацікавіць другіх з суседніх вёсак і запрашаюць іх прыйсьці на Арганізацыйны Сход.

Дня 20-га лістапада 1928 года, калі ад Старасты забароны на скліканьне Сходу ня было, ужо ад гадзіны 10 пачалі зьбірацца сяляне вёскі Пярэччы ў хаце Янкі Барады, потым падыйшлі сяляне з суседніх вёсак Казлы і Бодзяўкі і пачалася гутарка аб канешнай патрэбе Каапэратыву.

А 12 гадз. Міхась Лебяда, як адказная асоба, адчыніў Сход, прывітаў сабраўшыхся і запрапанаваў выбраць Старшыню сходу, двох лаўнікаў і сэкратара. На старшыню быў выбраны Лявон Саха, на лаўнікаў: Дзям'ян Вялікі і Сымон Каляда і на сэкратара добра пісьменны селянін Васіль Чорны. Новавыбраны прэзыдыум заняў сваё мейсца за сталом. Старшыня сходу Л. Саха прачытаў парадак дня і, па прыняцьці яго бяз зьменаў, было прыступлена да разгляду пунктаў.

1. Селянін з вёскі Казлы, Аляксей Дрозд, як чалавек знаёмы з каапэрацыяй, прачытаў невялікі рэфэрат аб мэтах, задачах і карысьці каапэрацыі на вёсках.

2. Старшыня сходу Л. Саха прачытаў дзеля азнаямленьня статут, які маецца быць прынятым і выясьніў яго прынцыпы.

3. Старшыня раздаў дэкларацыі прысутным і запрапанаваў запоўніць і падпісаць іх. Усе, як адзін, дружна пачалі запісвацца ў сябры, хто быў малапісьменны, дык прасіў другога, і праз кароткі працяг часу ўжо ўсе прысутныя злажылі дэкларацыі.

4. Старшыня запрапанаваў абгаварыць і выясьціць адпаведныя пастановы, што датычыць пунктаў 1, 5, 10, 12, 22 і 36 Статуту і сходам былі прыняты наступныя пастановы: п. 1. Каапэратыў будзе называцца: „Беларускі Спажывецкі Каапэратыў „Адраджэньне" ў Пярэччы з адказнасьцю паямі" (п. 5). Межы чыннасьці каапэратыва ёсьць Галынская гміна, а сядзіба ёсьць вёска Пярэччы (п. 10.) Уступная плата выносіць 2 злоты, а пай 15 зл., з якога 3 зл. плаціцца пры запісаньні ў сябры, а рэшта ратамі ў працягу году (п. 22). Наглядная Рада складаецца з 13 асоб (п. 36). Усе абвесткі будуць падавацца ў газэце „Poradnik Spółdzielcy". У гэтакім дапоўненым відзе статут быў падпісаны праз 14 прысутных сяброў-закладчыкаў, (бо на статуце трэба, каб было ня меней як 10 подпісаў). Кожны з іх напісаў імя, прозьвішча і дзе жыве. Вось, гэты прыняты Сходам статут выглядаў так:

Statut Białoruskiej Spółdzielni Spożywców „Odrodzenie" w Pierеczach.

1. Nazwa, cel, teren działalności i siedziba.
Art. 1. Spółdzielnia posiada i г. д. . . .
. . . .

і аж на астатняй 8 старонцы:

Członkowie założyciele: 1) Aleksy Drozd zamieszkały we wsi Kozły, gm. Hołyńskiej, 2) Jan Boroda zam. we wsi Piereczy, gm. Hołyńskiej, 3) Michał Lebieda zam. we wsi Piereczy, gm. Hołyńskiej, 4) Bazyli Czorny zam. we wsi Piereczy, gm. Hołyńskiej, 5) Michał Czaczołka zam we wsi Piereczy, 6) Joakim Ruchlawy zam. we wsi Piereczy, 7) Mikołaj Siniawa zam. we wsi Kozły, gm. Hołyńskiej, 8) Grzegorz Drobny zam. we wsi Kozły, 9) Tomasz Sołod zam. we wsi Bodziawki, gm. Hołyńskiej, 10) Dziemjan Sipucha zam. we wsi Bodziawki, 11) Jan Horki zam. we wsi Bodziawki, 12) Leon Sacha zam. we wsi Piereczy, 13) Arsenjusz Prytki zam. we wsi Piereczy, 14) Dziemjan Wialiki zam. we wsi Piereczy, gm. Hołyńskiej.

5. Потым прыступілі да выбараў сяброў у Нагляднуюю Раду. Вельмі паважна абгаварылі гэтае пытаньне, добра парадзіліся паміж сабой і сталі выстаўляць кандыдатаў— сялян талковых, разумных, сумленных і пісьменных. Да выбараў усе адносіліся з вялікаю павагаю. Галасаваньне было тайнае і ўсе пісалі на паперках сваіх кандыдатаў. Вынікі галасаваньня аказаліся наступныя: на сяброў Рады былі выбраны большасьцю галасоў: 1) Міхась Чачотка, 2) Якім Рухлявы, 3) Міхась Лебеда, 4) Лявон Саха, 5) Васіль Чорны, 6) Янка Барада — з вёскі Перэччы, 7) Аляксей Дрозд, 8) Мікалай Сінява, 9) Рыгор Дробны—з вёскі Казлы, 10) Янка Горкі, 11) Дзям'ян Сіпуха, 12) Тамаш Солад—з вёскі Бодзяўкі, на заступнікаў: 1) Дзям'ян Вялікі, 2) Сымон Каляда і 3) Арсень Прыткі, з вёскі Пярэччы. Праўда, усе гэта былі людзі сьвядомыя, зацікаўленыя каапэрацыяй, талковыя і сумленныя.

6. Нарэшце пастанавілі, што каапэратыў іх, калі будзе неабходная патрэба, можа браць пазычку, але ня больш як на 1.000 злотых.

На гэтым сход быў закончаны і сэкрэтар прачытаў пратакол ніжэйпаданага зьместу, які быў падпісаны праз Старшыню сходу, сяброў прэзыдыуму, сэкрэтара і некалькіх прысутных сяброў-закладчыкаў:

(Працяг будзе).

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Новыя правы ваяводаў.

Мін-ва ўнутр. спраў інфармуе аб некаторай зьмене правоў адміністрацыйных урадаў. Гэта: Права рашэньня ў справе зьмены прозьвішчаў, якое да гэтага часу мела толькі міністэрства, атрымалі і ўсе ваяводы за выняткам сьлёнскага. Важнае для нас беларусоў права зачыненьня і легалізаваньня таварыстваў ці арганізацыяў, працуючых на абшарах больш аднаго ваяводзтва прызнана віленскаму, наваградзкаму, валынскаму, палескаму і часткова беластоцкаму ваяводзе. Такія-ж правы прызваны і 4 ваяводам на абшарах этнаграфічна польскіх. Павятовым старостам Усходняй Галіцыі і гродзкім старостам у Кракаве і Львове дана права дазволу на выраб, гандаль і на дазвол мець забароненую зброю і амуніцыю.

Кватэрны дадатак для ўрадоўцаў.

У гэтым лістападзе прэзыдыум рады міністраў разглядаў справу кватэрнага дадатку для ўрадоўцаў. Дадатак мае быць ад 150 да 300 зл. для каждага ўрадоўца, у залежнасьці ад катэгорыі. Гэта будзе новым цяжарам для працоўных гушчаў.

Сэпаратызм польскіх Акадэмікаў.

Прэса падае, што: „каб сэпараваць (аддзяліць, адгарадзіць. Рэд.) польскую каталіцкую акадэміцкую моладзь ад ўсякага роду бязьверра, пад якое яна ня раз паняволі падпадае, будучы ў розных асяродзішчах (otoczeniu), польскія каталікі рашыліся пабудаваць у Кракаве аддзельны Каталіцкі Акадэміцкі дом. 18 лістапада г. г. адбылося асьвячэньне вуглавога каменя пад будову гэтага дому“.

Вось дык новыя часы старога езуітызму.

Мусім яшчэ адзначыць, што ў канцы г. сьнежаня ў Пазнані адбудуцца першыя місыйныя курсы для вучыцялёў і вучыцелек.

Вялізарны палітычны працэс.

338 Nr. „Rze-plitej“ інфармуе, што 10 сьнежня ў Львове распачнецца вялізарны палітычны працэс украінцаў. Усе яны абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да К. П. З. Украіны, зьяўляюцца жыхарамі Тарнопольскага ваяв. і былі арыштаваны ў пачатку чэрвеня г. году.

У самым Тарнополі быццам было арыштавана 9 чалавек, а ў акалічных вёсках 50 сялян. Па паўгодзе сьледзтва 31 аднаму з іх уручаны акт абвіненьня.

Сярод абвінавачаных 27 украінцаў, 2 палякі і 2 жыды. Быццам, амаль усе яны кандыдаты на паслоў па сьпіску Сельробу ў Тарнопольскай выбарчай акрузе. Закідаецца ім: галаўная здрада, публічны гвалт і іншае. Галоўным арганізатарам падсудных быццам быў нейкі Міхась Білый, які ў 1926 годзе быў прыгавораны на кару сьмерці, але пасьля новага суда быў звольнены. Цяпер ён быццам у Харкаве. У Львоў абвінавачаных даставяць спэцыяльным (!) цягнікам.

Заканчэньне сьледзтва ў справе Львоўскіх падзеяў.

Польская прэса коратка інфармуе аб заканчэньні сьледзтва ў справе разрухаў 1. XI. ў Львове:

У сувязі з гэтым, яшчэ колькінаццаць украінцаў адпраўлена (odstawiono) ў карны вастрог, („Rzecz-plita“ Nr. 338). Ім закідаецца публічная „збродня“ і гвалт.

Адначасна закончана ліквідацыйная акцыя Укр. Вайск. Арганізацыі на абшарах Львоўскага ваяводзтва.

Акты ўступнага сьледзтва разасланы як арыштаваным, так і пракуратуры. Значыць, не за гарамі і другі вялізарны і нязвычайна цікавы палітычны працэс...

Нешчасьлівы дзень у польскім лётніцтве.

20 г. лістапада ў Варшаве здарылася катастрофа аж 4 польскіх вайсковых самалётаў. Адзін лётнік, капітан-пілёт, забіўся на мейсца катастрофы, а апарат разьбіўся на шчэпкі. Рэшта лётнікаў цяжэй або лягчэй паранілася, а ў апаратах паламаліся крыла і іншыя часткі.

Уцекі 16 вязьняў.

Прэса інфармуе, што з вастрогу ў Грудзёндзу ўцякло 16 вязьняў. Уцяклі яны праз падкоп ў форме тунэлю пад сьцены турмы.

Заграніцай.

Яшчэ ў справе сэнсацыйнай падарожжы п. Дэвэя ў СССР.

Падарожжа амэрыканскага „фінансавага дарадцы“ ў Польшчы п. Дэвэя ў Маскву, як мы прадбачылі, выклікала вялікую сэнсацыю ў прэсе ўсяго сьвету. У тое, што гэта падарожжа мае „прыватны характар“, зразумела, як і мы, ніхто ня верыць, асабліва, калі даведаліся, што п. Дэвэй зьяўляецца асабістым прыяцелем прышлага прэзыдэнта Гувэра. Як паведамлялі газэты, радавы ўрад высылае, ці выслаў у Амэрыку спэцыяльную дэлегацыю—у справе фінансава-гаспадарчага паразуменьня паміж абодвума краямі, абяцаючы быццам значныя ўступкі амэрыканскім крэдытарам даваеннай Расеі ў справе іх даўгавых прэтэнзіяў, дый, зразумела, высоўваючы ізноў дамаганьні крэдытаў у Амэрыцы для СССР. Трэба думаць, што наагул, як Рады, таксама і новы прэзыдэнт Амэрыкі, жадаюць выкарыстаць усе магчымасьці ўзаемнага паразуменьня паміж абодвума вялізарнымі краямі — у справе ўзаемнага гаспадарчага супрацоўніцтва. Дзеля таго можна думаць, што Гувэр даў даручэньне Дэвэю асабіста разгледзецца ў палажэньні СССР на мейсцы і асабіста распачаць, можа, прадуступныя перагаворы.

З Масквы даносяць, што асабліва зацікаўлена прыездам амэрыканскага паўнамоцніка нямецкае пасольства, якое пэўне-ж не астанецца на баку пры ўзнаўленьні гаспадарчых стасункаў паміж Амэрыкай і СССР.

Згодна апошніх вестак, у хуткім часе амэрыканскі ўрад мае прызнаць С.С.Р.Р. de jure.

Перагаворы паміж радавым урадам і амэрыканскімі банкірамі ў справе даваенных даўгоў і новай пазыкі.

З Масквы падаюць весткі, быццам радавы ўрад высылае ў Амэрыку спэцыяльнага дэлегата Серабракова, які мае распачаць неафіцыяльна перагаворы з амэрыканскімі банкірамі ў справе частковага пакрыцьця Радамі даваенных расейскіх даўгоў у Амэрыцы, а таксама і—новай пазыкі.

Нямецкі парлямант даў згоду на будову браняносца.

16/XI нямецкі парлямант адкінуў—большасьцяй 255 галасоў проці 203, пры 8 ўстрымаўшыхся—прапазіцыю сацыял-дэмакратаў аб спыненьні будаваньня браняносца. Рэзультат гэткі можна было ўжо прадбачыць згары. Такім чынам, усё неяк абыйшлося „добра“, і габінэт сацыял-дэмакрата Мюллера зусім ня мае патрэбы выходзіць у адстаўку. Бо-ж сацыялісты, як наведамляюць з Бэрліна, самі найбольш баяліся, што пройдзе іх прапазіцыя, зробленая толькі дзеля ўнутраных меркаваньняў, як „акт самаабароны“ проці атакаў з боку камуністаў.

Узрост камуністычных уплываў у Нямеччыне.

Нямецкая прэса сцьвярджае шпаркі ўзрост камуністычных уплываў у Нямеччыне сярод работнікаў, астаўшыхся бяз працы —з прычыны масавых лёкаўтаў (выкіданьня работнікаў з працы — з прычын зьмяншэньня прадукцыі).

А ў цэлым шэрагу местаў дайшло ўжо да бурных здарэньняў. Безработныя робяць паходы і дэманстрацыі, штурмуюць магістраты і г. д.

Побач з тым узрастае і забастовачны рух, пагражаючы агульнай забастоўкай у краі.

Літоўскія збраеньні (?).

Вільня даведалася з Коўна (?), быццам літоўскі ўрад закупіў заграніцай на 1.700.000 літаў навейшых абразцоў усялякага аружжа, пераважна англійскага і нямецкага вырабу. Адначасна літоўскі ўрад вядзе перагаворы з Англіяй у справе закупу для літоўскага флёту 2 падводных лодак, аднаго мінаносца і 2 гандлёвых параходаў. Апрача таго, літоўскі ўрад падпісаў умову з адной з гамбургскіх (нямецкіх) карабельных закладаў — на будову для Літвы яшчэ 6 караблёў рознага назначэньня.

Здаецца, такая малая гэта Літва—амаль што не адна былая губэрня, а вось аднакжа... хапае фінансаў навет на ўласны флёт. Асабліва цікаўна, што ў збраеньні Літвы дапамагае ёй Англія. Відаць, ня так ужо дрэнна стаяць у Англіі „фонды“ Вальдэмараса“.

Забастоўка чыгуншчыкаў у Фінляндыі і дапамога ім з боку радавых прафсаюзаў.

„Маскоўская Праўда“ даносіць, што радавы прафсаюз чыгуншчкаў пераслаў 10 тысяч рублёў забастовачнаму камітэту камунікацыйнымных працаўнікоў у Гэльсінгфорсе (сталіца Фінляндыі). Цэнтральная Рада радавых прафсаюзаў заапекавалася пляновай дапамогай бастуючым работнікам у Фінляндыі.

Замах на цягнік з найвышэйшымі латвійскімі саноўнікамі.

13/XI цягнік, у якім ехалі з лібаўскіх вайсковых урачыстаўсьцяў Прэзыдэнт Рэспублікі Зэмгальс, старшыня парляманту і вышэйшыя афіцэры штабу, быў раптам спынены ў ходзе. Аказалася, што ў стык паміж рэльсамі была уложана сякера, якая напэўна выклікала-бы катастрофу цягніка. Ці гэта была спроба замаху, ня высьветлена. Але—на ўсялякі выпадак паарыштаваны розныя падозраныя асобы—з „крайніх партыяў“.

Турцыя ня хоча ўваходзіць у Лігу Нацыяў.

Венская прэса публікуе заяву турэцкага міністра заграічных спраў, які, паміж іншым, падчыркнуў, што Турцыя ня мае жаданьня ўвайсьці ў склад Лігі Нацыяў, бо „гэта ўстанова—ня што іншае, як пакорная прылада у руках пераможцаў“.

Закладайце свае, беларускія, каапэратывы.

Каапэрацыя — гэта шлях да перабудовы грамадзкага ладу на новых, больш справядлівых падставах.

Каапэрацыя — гэта адзін з відаў сацыяльнай барацьбы працоўных за лепшую будучыню.

Дык твары каапэрацыю і абмінай прыватнага гандляра, як заразу!

Наша хроніка.

Канфіската. Па загаду Гарадзкога Старасты № 1 нашай газэты канфіскаваны за **„Куток Моладзі“**, а таксама дзьве заметкі з палітычнай хронікі: **„Нямецкая прэса аб украінскім руху ў Польшчы“**, і **„Нямецкая нацыяналістычная прэса аб 10 лецьці польскай незалежнасьці“**.

І яшчэ канфіскавана па загаду Гарадзкога Старасты на места Вільню прамовы паслоў Беларускага Сялянска - Работніцкага Клюбу — Я. Гаўрыліка і Ф. Валынца, сказаныя імі ў Сойме падчас абароны экстраных прапазіцыяў у справе зачыненьня Радашкавіцкай Гімназіі і прычыненьня і адчыненьня Т-ва Беларускай Школы.

Надзвычайны Агульны Сход сяброў Белар. Каапэр. Банку ў Вільні. Управа Беларускага Каапэратыўнага Банку ў Вільні гэтым паведамляе, што, згодна пастановы Нагляднай Рады і Управы Банку ад 24 кастрычніка г. г. і на падставе § 34 Статуту, адбудзецца **надзвычайны агульны Сход сяброў** Банку **8 сьнежня 1928 года** ў 4 гадзіны папаўдні, у памяшчэньні Банку (Вільня, Віленская 8).

Парадак дня:

1) Адчыненьне і выбары Прэзыдыуму Сходу, 2) Адчытаньне пратаколу папярэдняга Агульнага Сходу, 3) Адчытаньне пратаколу ўрадавае рэвізіі, 4) Даклад Управы аб дзеяльнасьці Банку, 5) Даклад Нагляднае Рады, 6) Зьмена Статуту Банку §§ 1, 15, 16, 20, 23, 37 і 40, 7) Перадача правоў Агульнага Сходу З'езду дэлегатаў, 8) Давыбары сяброў Нагляднае Рады, 9) Бягучыя справы.

Управа.

Агульны Сход сяброў Навасьвецкага Гуртка Т-ва Бел. Школы. 4-га сьнежня 1928 г. ў 7 гадз. увечары адбудзецца агульны сход сяброў Навасьвецкага Гуртка Т-ва Белар. Школы ў памешканьні таго-ж Гуртка (Шкаплерная вул. № 43-а). Парадак дня наступны. 1) Справаздача з працы Ураду Гуртка, 2) Выбары дэлегата на агульны сход Т-ва Белар. Школы, 3) Пашырэньне бібліятэкі Гуртка.

Прысутнасьць усіх сяброў абавязкава.

Патранат пры Гімназіі. Пры Беларускім Дабрадзейным Таварыстве ў Вільні ўтварыўся Школьны Патранат для нагляду над школьнымі інтэрнатамі для вучняў і вучаніц Віл. Беларускай Гімназіі. Старшыня Школьнага Патранату грам. Ф. Стэцкевіч, дырэктар Гімназіі, сэкрэтар грамадзянін У. Лукашэвіч.

Зьезд Беларускай Хадэцыі. У нядзелю 25 лістапада адбыўся Зьезд беларускай хр.-дэмакратычнай партыі. Падробнасьці і ацэнку падамо ў наступным нумары.

Беларуская санацыя ў новай ролі. Збанкрутаваная беларуская санацыя, пацярпеўшы поўную няўдачу ў грамадзкім жыцьці, вынайшла новы спосаб ужо напоўасабістага змаганьня з прадстаўнікамі сялянска-работніцкай думкі. Яны распускаюць правакацыйныя чуткі аб розных здарэньнях з жыцьця і грамадзкай дзейнасьці гэтых прадстаўнікоў; чуткі, ні на чым не аснованыя, з мэтай напісаць і скампраметаваць гэтых прадстаўнікоў. Яны гэтыя чуткі пашыраюць і ў народ праз тыя асобы, якія прыяжджаюць у Вільню і, ня ведаючы запраўднага твару здраднікаў, заходзяць да іх па старой традыцыі. Аб'ектам нападак і подлых інтрыгаў стаўся асабліва пасол І. Дварчанін.

Папераджаем нашу „нявінную“ санацыю, што, калі гэта будзе рабіцца далей — будзем выяўляць усе імені інтрыганаў да публічнага ведама, не зважаючы на розныя „заслугі“.

Коўш на відоўні. Адзін з папіхачоў нашай санацыі (поруч з Янкам) вядомы сьвяшчэньнік А. Коўш у апошні час зусім незаслужана стаўся чуць ня героем дня.

Яшчэ каля 10 лістапада манархічная газ. „За Свабоду“ зьмясьціла карэспандэнцыю з Вільні, у якой, паведамляючы аб жаданьні Каўша і Астроўскага захапіць Пятніцкую царкву з дадаткам маеткаў Мікалаеўскай царквы, карэспандэнт страшэнна нападае на названых горадзенчаў, чуць не абвіняючы галоўна ў жаданьні захапіць маетак.

У № 271 гэтай-жа газэты зьявілася пісьмо Каўша, дзе ён адкідае гэтыя закіды і, выстаўляючы сябе ягняткам, падае некаторыя характарыстычныя факты.

З пісьма вынікае, што галоўным астоем прыходу будуць зьяўляцца вучні Бел. Гімназіі, якіх ужо ад пэўнага часу Каўшы і яго кіраўнічыя сілаю заганяюць у царкву, абы толькі даць прастор для „дзеяльнасьці“.

Далей паведамляецца, што замену ц.-славянскае мовы ў набажэнстве беларускай — Коўш лічыць шкадлівай і што ні ён, ні яго аднадумцы да гэтага ня імкнуцца.

Нарэшце падае факты, якія нібы сьведчаць аб яго папулярнасьці сярод насяленьня.

Коўш выказваецца і ў другой расейскай газэце „Наша Жизнь“ у стацьці „Беларусізацыя праваслаўнай царквы“. З яе даведваемся, апрача сказанага ў пісьме ў „За Свабоду“, яшчэ некаторыя цікавыя рэчы, а іменна:

„Царква стаіць вышэй палітыкі“!... і што, аднак, „вялікое дабро было-б, каб духавенства ўзяло ў свае рукі пытаньне нацыянальнага самавызначэньня народаў“. Далей, што „задача царквы панаваць над кірункам духу часу і кіраваць яго да большай славы Усявышняга“. Урэшце „калі духавенства свабодна і рашуча стане на чале нацыянальнага руху, пастараецца ўзяць яго ў свае рукі і ўмела... пакіруе яго, то народ яму без асаблівага адцягваньня падпарадкуецца і будзе яго багаслаўляць. (Чорны наш. Рэд.).

Смачны жабе гарэх, але зубоў, на шчасьце, ня мае.

„Дзіва над дзівамі“. Як ведама, „Беларускі Дзень“ і „Грамадзянін“ дасюль толькі і рабілі, што кадзілі сваім паном пры ўсякім выпадку. Аж вось цяпер калі „Бел. Дзень“ задзяржаў свой лёкайскі спрыт, „Грамадзянін“ вельмі асьцярожна, але ўсё-ж выказаў сваю нязгоду з лікаваньнем усяе буржуазнае Польшчы з прычыны дзесятых угодкаў існаваньня (стацьця „Юбілейны год“).

Проста „дзіва над дзівамі“!

Зварочвае ўвагу яшчэ штось. „Дзень“ пачынае хваліць „Янку“, а „Грамадзянін“ — ганіць. З гэтага можна заключыць, што сьмерць „Грамадзяніна“ настане раней „Бел. Дня“.

Для нас гэта—ўсё роўна!

Насіў воўк, панясьлі і воўка. Усім ужо хіба ведама, што ППС — гэта стары і сталы здраднік працоўных масаў Польшчы. Але не адны толькі ППС-ы ўмеюць здраджваць, знайшліся майстры (у самой ППС), што здрадзілі і ППС. Гэта, так званая „рэвалюцыйная фракцыя ППС“, якая адкрыта выступіла за супрацоўніцтва з буржуазіяй, ці іначай здрадзіла ППС-аўскаму маскаваньню клясавым змаганьнем.

Па расколе ў Цэнтр. Кам. ППС у Варшаве, раскол пашырыўся і на правінцыяльныя камітэты, напр. у Любліне і іншых і ўжо дакаціўся да Вільні, дзе сябра пэпээсаўскага Акр. Кам. і старшыня Кола паштоўцаў „пан“ Маркевіч, выступіў з ППС і прыняўся да арганізоўваньня камітэту „рэвалюцыйнай фракцыі ППС“. До „пана“ Маркевіча ўжо далучылася 10 „паноў“ пэпээсаўскіх дзеячоў.

Так, насіў воўк, а цяпер панясьлі воўка...

З другога боку, з аслаўлянай цёмнай славаю здрады працоўных „сацыялістычнай“ ППС выступаюць ня толькі „паны“, якім надаела працоўная маска, але і самі працоўныя, якія ўжо добра ўбачылі „сацыялістычнасьць“ сваіх пэпээсаўскіх павадыроў дурыгаловаў.

Так, надовячы ў салі Акружной Камісіі Праф. Саюзаў, належачых да ППС, на Кіеўскай вуліцы 19 (Вільня) адбылося паседжаньне гэтых прафсаюсаў, прысьвечанае выбарам новай Акр. Камісіі.

Дзеля таго, каб нам ніхто ня мог закінуць нейкай староннасьці, падаём прабег гэтага паседжаньня паводле польскай прэсы: „K. W.“ № 272.

„У рэзультаце паседжаньня, якое закончылася агульнай бойкай, прадстаўнікі Саюзу Транспартоўцаў, Касы Хворых, Валаскянага Саюзу і Саюзу Дазорцаў (Дворнікаў) пакінулі салю паседжаньня, падаючы пісьмовую заяву аб выхадзе з Акружной Камісіі Прафсаюзаў ППС.

Даўно-бы так!

Вялізарны палітычны працэс у Наваградку. 27 лістапада г. г. у Акружным Судзе ў Наваградку распачаўся вялізарны палітычны працэс беларускіх сялян (пэўна, былых грамадаўцаў), на чале з паслом Беларускага Сял.-Раб. Пасольскага Клюбу Стагановічам. Апрача пасла Стагановіча, да падсудных працэсу належаць грам. Аляшкевіч, Грыц, Антон Малец, Янка Малец, Антон Малец II-гі, Журко, Хвасько, Міхалеўскі і іншыя, — усіх 21 чалавек.

Суд складаецца з старшыні — судзьдзі Мурзы-Мурзіча і судзьдзяў Паўлюця і Карповіча. Абвінавачвае пракуратар Ходэцкі. Бароняць адвакаты; Сьмяроўскі, Гонігвіль, Гушэр, Будахоўскі, Аляксюк і Совірыд.

Усе абвінавачваныя адказваюць з вастрогу.

Прабег суда падаём (з цэнзурных прычынаў) паводле польскай прэсы — манархістычна-абшарніцкага „Słowa“ № 274.

Усе падсудныя абвінавачваюцца ў камуністычнай дзейнасьці на абшарах Наваградзкага і Баранавіцкага павету. Акт абвінавачаньня кажа (паводле „Słowa“), што „ў 1927—28 годзе на абшарах Наваградзкага ваяводзтва існавала камуністычная арганізацыя. Ваякавая дзейнасьць гэтай арганізацыі праяўлялася ў пастаці вечаў, распаўсюджваньні камуністычных адозваў, вывешваньні чырвоных штандараў з антыдзяржаўнымі лёзунгамі, у вывратовай агітацыі і камуністычных дэманстрацыях. Дзейнасьць найбольш павялічылася ў часе выбараў у Сойм і Сэнат, калі паасобныя сябры партыі ладзілі канфэрэнцыі, на якіх амаўлялі, ня толькі партыйныя справы, але і як падтрымліваць „замаскованы камуністычны (Б. С.-Раб.) сьпісак № 39“.

Далей „Słowo“ піша, быццам сцьверджана: „што аддзельныя сябры партыі мелі агнястрэльную зброю і апараты на адбіваньне адозваў. У часе ліквідацыі знойдзена багаты кампрамітуючы матар'ял у пастаці зброі, брашураў, заметкаў, акрэсьліваючых патрэбныя выдаткі, адозваў, шапіраграфаў, справаздачы і г. д.“.

„Ніці давялі аж да Варшавы, дзе арыштаваны нейкі Нестар Аўдзяюк, быццам сябра Цэнтр. К-ту К. П. З. Б., з адшыфраваных знойдзеных у яго нататкаў быццам сцьверджана, што К.П.З.Б. мае на абшарах Наваградзкага павету свае склады зброі і што Выканаўчы Камітэт ППС фінансуе сьпісак № 39 (проста сэнсацыя, Рэд.). Далей быццам сцьверджана, што Антон Малец меўся з даручэньня партыі вясьці эвідэнцыю (сьпіс) і зьбіраць зброю“.

„Далейшыя ніці“, піша названая газэта „давялі да Міхалеўскай, працуючай пад псэўдовімам „Шурка“, быўшай сэкрэтаркай Акружнага Камітэту ў Баранавічах“.

„Па адчытаньні акту абвінавачваньня суд выслухаў усіх абвінавачаных...

толькі 6 прызналася ў прыналежнасьці да камуністычнай партыі, але да ніякай віны не прызнаюцца".

На гэты працэс паклікана разам 115 сьведкаў. Сьведкі пракуратуры пацьвярдзілі матывы абвіненьня. Цікава, што з боку абароны адказваў сьведка навагрудзкі стараста Грынеўскі. На пытаньне, што ён можа сказаць аб паслу Стагановічу, сьведка — навагрудзкі стараста — сказаў, што „знае яго, як вельмі добрага селяніна (rolnika) і чыннага дзеяча на груньце падтрымліваньня земляробскай вытворчасьці". Калі хтось з абароны спытаў, што сьведка ведае аб паслу Дварчаніну, адказаў, што ўважае яго „за камуністычнага дзеяча" (у п. старасты, як ведама, усе нялюбімыя яму беларусы, тым болей радыкальнага кірунку — камуністы!).

Па паказаньнях яшчэ некалькіх сьведкаў суд адложаны на наступны дзень.

Аб далейшым прабегу суда падамо ў наступным нумары.

З Т-ва Бел. Школы.

З працы Гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

28. X. 28 г. Валілаўскім гурт. Т-ва Б. Шк. ў вёсцы Валілах Беластоцкага пав., ў уласным памешканьні, быў наладжаны спэктакль-вечарына. Згулялі: „Страхі жыцьця"— драму ў 3 акт Аляхновіча і „Зьбянтэжаны Саўка"—жарт у 1 дзеі Родзевіча. Спэктакаль прайшоў добра і пакінуў на глядзельніках прыемнае ўражаньне.

18. XI. 28 г. Драматычная сэкцыяй Беластоцкага гуртка Т-ва Бел. Шк. ў м. Заблудаве Беластоцкага пав., быў наладжаны спэктакль. Згулялі: „Страхі жыцьця" драму ў 3 дзеях Аляхновіча і „Чорт і баба" — жарт у 1 дзеі гэтага самага аўтара.

П а д з я к а.

Вучнёўская часовая камісія, пры Віл. Бел. Гімназіі, прыносіць шчырую падзяку гуртку Т-ва Бел. Шк. у в. Тапілец, Беласт. пав. за ахвяраваныя незаможнаму вучню А. П., грошы ў суме 22 зл. 47 грошай.

З жыцьця Горадні.

✕ **Працэс.** 19 кастрычніка с. г. у Горадзенскім Акружным Судзе разглядалася справа Аляксандра Абрамовіча і Пётра Бедэса, якім закідвалася прыналежнасьць да Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі. Па кілька гадзіннай нарадзе суд выдаў прысуд, якім Бедэса ўнявініў, а Абрамовіча засудзіў на 4 гады цяжкага вастрогу. Трэба дадаць, што абодва абвінавачаны сядзелі ў вастрозе больш як два гады, чакаючы вось гэтак суду.

✕ **Радны павятовага сойміку парушае гэтую справу.** Свайго часу на пачатку г. г. Горадзенскі павятовы соймік на адным з сваіх паседжаньняў асыгнаваў на карысьць бібліятэкі-чытальні, якая існуе пры Гор. Акр. Управе Т-ва Бел. Школы — 500 зл. Грошы вось гэтыя, няведама з якіх прычын, не далі на рукі Управе Т-ва, а запатрабавалі ад Управы сьпіс, у якім павінны былі адмеціць, якія кніжкі Управа жадае набыць для бібліятэкі-чытальні. Ведама праз некалькі дзён сьпіс быў прадстаўлены, а праз некалькі месяцаў па гэтым вось сьпісу Соймік закупіў кнігі ў Беларускай Кнігарні. Закупленыя кніжкі перад даручэньнем Т-ву Бел. Школы стараста меўся праглядзець іх, відаць, каб часамі ня было між імі такой, якая магла-б дэмаралізаваць чытача... але гэты вось прагляд цягнецца неяк ужо каля паўгода, дзеля чаго ня ведама, ці так доўга пан стараста іх праглядае, ці яны дзе колечы сабе ляжаць зваленыя ў кут ды мышы іх пераглядаюць, даволі таго, што, як кажуць сябры Управы Т-ва, кніжак яшчэ не даручылі і ня ведама калі даручаць, а тымчасам ужо мінае год, як гэта справа цягнецца. Надыходзіць зіма, а з ёю доўгія вечары. Селянін, які толькі ў зіму мае вольную хвіліну, ня будзе мець над чым карысным правясьці вось гэтыя вечары.

Дык вось, каб для нашага беларускага грамадзянства гэтыя зімовыя вечары не праходзілі без карысьці, трэба, як у найхутчэйшым часе беларускаму прадстаўніцтву (а яго даволі ёсьць у сойміку) парушыць гэтую справу, справу перадачы ўжо закупленых для Т-ва Бел. Школы кніг, бо гэтага чакае ад вас, як беларускае грамадзянства Горадні, так і паветы.

Горадня 5.XI 28 г. „Арк".

Карэспандэнцыі.

„Сушаць"!..

(Браслаўшчына).

Радуйцеся, сяляне! Цешцеся, браточкі! Бо нарэшце прыйшоў да нас ратунак! Нарэшце, чаго мы гэтак доўга жадалі і гэтак прасілі-малілі нашых „паслоў-заступнікаў", вызваленцаў ды сельсаюзьнікаў і што яны нам гэтак шчыра дакляравалі,—ужо маем.

Бо, ведаеце, вынайдзены новы „выналязак", які павылічыць нашы вузенькія палоскі! Але, але, браточкі! Досыць ужо гібець на гэтых няшчасных дзесяцінках, досыць цярпець гэтага праклятага „сярбая", які што вясну чысьцютка вымятае нашы і бяз таго пустыя гаруды, а нас саміх, пасярбаўшых голенькага шчавяльку, гоніць жабраваць, або рабіць да пана...

Ужо гэтага больш ня будзе. Будзем толькі ўспамінаць аб перажытым, як аб страшным сьне. Бо-ж бачыце, гэты „выналязак" дасьць нам вялікія абшары зямлі!.. Толькі не падумайце, што гэта выдумаў Сойм! О, не! Дзе яму беднен ькаму! Яму цяпер не да гэтага. Ён сам ні жывы ні мёртвы. Не! Гэта просты, тэхнічны спосаб асушкі зямлі з-пад вады. Апошняе слова тэхнікі!.. Цяпер ня будзе ані рэк, ані вазёр (здаецца і мароў), усё будзе высушана! Тамака, дзе цяперака яшчэ гуляюць хвалі, плаваюць чоўны ды розныя караблі, дзе ў непамерных глыбінях жывуць рыбы ды поўзаюць розныя гады — будзе сухутка! Сяляне тамака будуць гараць, сеяць, садзіць капусту, буракі, бо-ж тамака павінна быць сабе добрая зямліца. Вось калі мы зажывем! Вось калі забагацеем! Тады няхай сабе хоць адразу па два ходзяць сэквэстратары — ня спужаемся, бо будзе чым ад іх адбараніцца. Нарэшце і аб нас, гарамыках, падумалі. А то-ж гэную „рэформу рольну", трасца ёй у бок, ані як ня можна была дачакацца. Усё кажуць: зараз ды зараз, пачакайце ды пачакайце, а зямлі, як няма дык і няма.

Ажна тутака зусім неяк неспадзявана прыяжджаюць да нас нейкія „каморнікі", і, ня думаючы доўга, адразу рукавы — роўна локця і—да працы г. зн. узяліся возера Дрывята сушыць (пэўне, даведаліся, што нам пільна патрэбна зямля).

Дык вось гэтыя самыя паны „каморнікі", азброіўшыся у нейкія прылады, пачалі мерыць увакруг возера (мусіць, каб даведацца, сколькі ў ім ёсьць вады). Мерылі яны, мерылі, усе пожанькі нашы павымерылі, усе балоты павыбрадзілі і ўсё нешта запісвалі ды нейкія калы ў прывалы заганялі, не раўнуючы як-бы хутары адбівалі. Пэўне са два гады гэтак працавалі. Чыста, беднен ькія, зацягаліся па нашых балотах, ледзь ногі валачылі. Ды і нічога дзіўнога, бо па нашых балотах толькі нашы каровы і могуць хадзіць... Але нарэшце скончылі.

Чакаем гэта мы, ці скора вада ў возеры высахне і пакажацца дно. Але, бачым, што вада неяк ня ўбывае, а наадварот... прыбывае. І з кожным гэта днём неяк усё болей і болей.

Нарэшце... пазалівала ўсе нашы балоты, сенажаці, дабралася і да калоў, што „каморнікі" пазаганялі. Хутка і калы схаваліся пад вадой, а вада ўжо пад самыя гароды падбіраецца. Бачаць сяляне, што не пераліўкі, патопяцца ўсе, як трусы,—на коні ды гайда ў места шукаць якога небудзь ратунку. Прыяжджаюць—ажна тамака яшчэ горай. Вада гуляе па ўсяму месту, а жыды ды розныя ўрадоўцы хто ў дзежцы, кто ў начоўцы, а хто дык зусім на дошцы „вазіняюцца", не-раўнуючы як у Вэнэцыі.

Паглядзелі на гэта сяляне, узлезшы на пагорак ля ветрака, бачаць, што ніякага тут толку не даб'ешся, вярнуліся хутчэй да хаты ратаваць сваё дабро. Але тымчасам неяк і вада затрымалася і навет пачала спадаць, але спаўшы роўна калоў далей ані руш, круціцца каля іх, як зачараваная, ажна пеніцца. Уздыхнулі тады свабодна сяляне—рады, што хоць манаткі цэлыя засталіся.

Дык вось, браточкі, калі і ў вас будзе гэткая сушка, дык ня надта палохайцеся, што вада пазалівае ўсе вашыя балоты ды сенажаці. Таксама не бядуйце, калі вашая жывёліна будзе ляскаць зубамі галодная, ды ад ветру хістацца. Хвароба яе ня возьме, ня здохне! За тое, за гадкоў 10 ць, як лёду, будзеце мець, замест цяперашніх непралазных балотаў, „культурнэ лонкі", а зямлі дык колькі хочаш.

„Селянін".

Нам пішуць з вёскі яшчэ, што:

— **Хут. Дабраволя, Пружаншчына.** У гэтым годзе зьявіўся ў нас „новы" падатак, як процант ад розных „драговых" „грунтовых" і пад., на папраўку публічных дарогаў. Багацейшыя заплацілі, а бяднейшыя, ведама-ж—не. І вось у самы гарачы час, калі праца кіпіць у полі, гэтых незаплаціўшых сялян пачалі ганяць на работу. Пры чым цана такая нізкая, што проста немагчыма. Тады сяляне пачалі прадаваць свае апошнія лахманы, каб толькі пазбавіцца прыгону. Аднак, сама ўрад грошы браць не захацеў, тлумачачы тым, што ўжо позна (?!).

Вось як нам жывецца! Кідай збожжа ў полі—хай гніе і высыпаецца апошняя жменя, а ідзі на работы.

Ну, і „папраўляюць" дабрабыт селяніна?!

Звон.

— **В. Рыбчыня, Вялейскага пав.** Моладзь у нашай вёсцы, замест а вясьці культурна-асьветную працу, п'е гарэлку і робіць бойкі з хлапцамі іншых вёсак. Гэтак, напр., здарылася ў час Пахомаўскага фэсту, калі моладзь, напіўшыся, пакалечылася ўзаемна. Сорамна, таварышы!

Глянь це кругом сябе! Жыцьцё кіпіць. Жыцьцё кліча да змаганьня за лепшае заўтра. А вы пачынаеце самы з сабою біцца. Апомніцеся.

А. Р.

— **В. Шэні, Пружаншчына.** Моладзь наша з кожным днём усьведамляецца. Ломіць перашкоды. Т-ва Бел. Школы працуе ўва ўсю, дзякуючы моладзі. Частыя спэктаклі сьведчаць аб тым, што моладзь запраўды, бярэцца за працу на карысьць працоўнага народу. Заложэньне пры надзвычай цяжкіх варунках бібліатэкі „Адраджэньне"—таксама сьведчыць аб гэтым.

Трэба толькі пажадаць, каб і моладзь іншых вёсак пакінула піць гарэлку, займацца разбоямі, а таксама ўзялася за культурна-асьветную працу.

Агонь.

— **У в. Харашні. Дварэцкае вол., Навагрудзкага пав.** 21 кастрычніка арганізаваўся Гурток Т-ва Бел. Шк. На арганізацыйным сходзе было 11 чалавек. Пастаноўлена было закласьці ў вёсцы бібліатэку-чытальню і выбраны для яе загадчык, а таксама наладзіць у як найхутчэйшым часе спэкталь. Апроч складак, кожны сябра заплаціў па 5 зл., каб выпісаць кніжак.

Яшчэ адна зорка працоўнай культуры засьвяціла над цёмнай вёскай!

Дуброва.

— **У м-ку Новы-Пагост, Браслаўскага пав.** жыў у свайго цесьця бедны, беззямельны Віктар Чарніўскі. Сёлетні год, год неўраджаяў і стыхійных катастрофаў у прыродзе, паставіў яго на апошнюю ступень галіты і давеў да нечага страшэннага...

Хворы, ледзь пераводзячы дух, бядак, узяў лейцы, якія яшчэ не пасьпеў апісаць сэквэстратар, пайшоў у гумно суседа і там пакончыў сваё жыцьцё.

Горкі.

— **Мілевіцкі Гурток Т-ва Бел. Шк. (Курылавіцкая вол., Слонімскі пав.)** 14 кастрычніка наладзіў спэктакль. Паставілі „Суд". Усё было вельмі добра. Але вось прыйшоў п'яны солтыс, які захацеў паказаць сваю „ўладу". „Павышаным" голасам ён заявіў: „Ведаеце, што гэта я? Я назначаны бараніць польскую ўладу і г. д."!

Добрых абаронцаў маюць нашыя паны, няма чаго казаць!

Вясковы.

З Радавае Беларусі.

Павялічэньне зарабатнай платы.

З 1-га кастрычніка пастановай Савнаркому БССР, падвышана зарабатая плата для служачых.

Так школьным працаўнікам сельскіх школ устаноўлена стаўка ў 44 рублі ў месяц, вучыцялём у гарадох і раёнах — 70 рублей (раней 60).

Старшым міліцыянерам — 42 руб. ў месяц, малодшым—40 ў гарадох і 36—ў раёнах.

У сярэднім зараб. плата міліцыянерам павялічываецца на 7—8 працэнтаў.

Экспорт кніг.

Управа Дзяржаўнага гандлю БССР прыступае да экспорту за межы беларускіх, жыдоўскіх і іншых кніг выданьня Белдзяржвыдавецтва. Ужо вядуцца перагаворы з Чэхаславацкімі кніжнымі фірмамі аб экспорце беларускіх кніг, на якія там маецца вялікі попыт.

2500 слухачоў — на сельска-гаспадарчыя курсы ў Гомельшчыне.

У зьвязку з новым земляўпарадкаваньнем вёскі і пераходу да новых больш дасканальных мэтадаў вядзеньня гаспадаркі зьяўляецца патрэба распаўсюджаньня сельска-гаспадарчай веды сярод мясцовага сялянства. У сёлетнім гаспадарчым годзе ў Гомельскай акрузе арганізавана 60 курсаў. У арганізацыі гэтых курсаў бяруць удзел: сялянскі саюз, малочны саюз, садовы саюз і хата селяніна.

Адчыняюцца наступныя курсы: курсы па калектывізацыі, тэрмінам па 2 месяцы на 60 чалавек, па вырабу масла на 40 чалавек. Курсы маюць сваей мэтай падрыхтаваць майстроў-масларобаў для розных арцеляў.

Арганізуюцца курсы па садоўніцтву і гародніцтву на 60 чалавек, курсы па культуртэхніцы, гідратэхніцы (водных работ) і тарфяной справе, курсы па агнятрываламу будаўніцтву на 45 чал., рахунковыя курсы, якія падгатовюць 50 рахункаводаў для крэдытных таварыстваў і 40 рахункаводаў для малочных кааператываў.

Наагул, праз усё ўспомненыя курсы будзе прапушчана да 2500 слухачоў. Слухачоў доўгатэрміновых курсаў дадзена дармавое памешканьне і харчы. Кошт гэтых курсам аблічаны на 28 тысяч рублёў.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Прашу на старонках Вашай паважанай газэты зьмясьціць наступнае:

У зьвязку з тым, што я знаходжуся ў Паўнамочнай Камісіі па скліка765ньню Зьезду Т-ва Белар. Школы, пашырыліся чуткі, што я пакінуў рады змагароў за вызваленьне беларускіх працоўных гушчаў і перайшоў да лягеру Я. Станкевіча і яго кумпанаў.

Гэтым заяўляю, што з самага пачатку здаваў сабе справу з таго, што прыкрыцьцё і адкрыцьцё зноў Галоўнай Управы Т-ва было актам, скіраваным да разьбіцьця масавай вызваленчай культурна-асьветнай арганізацыі беларускіх сялян і работнікаў.

Уваходзячы ў Паўнамочную Камісію, я зрабіў гэта дзеля таго, каб, як прадстаўнік сялян і работнікаў, мець кантроль над працай Камісіі і прысьпяшаць склікаўньне Зьезду, процістаўляючыся г. зв. санацыраваньню Т-ва Белар. Школы.

Пастанову аб адкладзе Зьезду, які зьяўляўся аб'ектыўна далейшым актам па разьбіцьцю гэтай арганізацыі, я падпісаў не з якіх небудзь прынцыповых меркаваньняў, а тэхнічнай немагчымасьці склікаць Зьезд, з думкай, што гэты адклад зроблены ня болей як на два тыдні.

Я запэўняю беларускія працоўныя масы, што ў далейшым буду таксама змагацца, каб Т-ва Белар. Школы захавала той самы характар масавай беларускай арганізацыі, якой было да гэтага часу, як роўна-ж і за ўступленьне Паўнамочнай Камісіі ўраз-жа па склікаўньню зьезду і выбару Галоўнай Управы з ліку шчырых беларускіх сялянска-работніцкіх дзеячоў.

Кузьма Крук
Радны м. Вільні.

29/XI 1929 г.

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпісчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўняе ей існаваньне.

М. Пецка

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.